# Створаны аргкамітэт для падрыхтоўкі і правядзення ТІБО-2020

6 сакавіка 2020 Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Сяргей Румас падпісаў распараджэнне № 88р, згодна з якім ствараецца арганізацыйны камітэт для падрыхтоўкі і правядзення 18-22 мая 2020 г. у г. Мінску XXVII Міжнароднага форуму па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях ТІБО-2020.

Згодна з дакументам арганізацыйнаму камітэту даручана: распрацаваць і зацвердзіць канцэпцыю XXVII Міжнароднага форуму па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях ТІБО-2020; забяспечыць скаардынаваную працу па своечасовым і якасным фарміраванні экспазіцыі, падрыхтоўцы і правядзенні праграмы дзелавых мерапрыемстваў форума; падрыхтаваць па выніках названага форуму справаздачу аб выніках яго правядзення; пры неабходнасці прыцягваць да працы па падрыхтоўцы і правядзенні названага форуму кіраўнікоў і спецыялістаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама і іншых арганізацый.

У склад камітэта ўвайшлі кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, закрытага акцыянернага таварыства «Тэхніка і камунікацыі», грамадскага аб'яднання «Інфармацыйнае грамадства», асацыяцыі арганізацый інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій «Белінфакам», замежнага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Эпам Сістэмз» і інш.

Старшынства арганізацыйнага камітэта ўскладзена на Першага намесніка Прэм'ер-міністра Дзмітрыя Крутога.

Паводле інфармацыі Нацыянальнага прававога Інтэрнэт-партала Рэспублікі Беларусь

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/10-03-2020-6082*